

*Суша Г. А.,*

метадыст аддзела традыцыйнай культуры і аматарскай творчасці ДУА «Інстытут культуры Беларусі», член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці

## НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ БЕЛАРУСКІЯ ПРОМЫСЛЫ І РАМЁСТВЫ. САЛОМАПЛЯЦЕННЕ Ў БЕЛАРУСІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нішто так не сведчыць пра этнічную самабытнасць, як самабытнае мастацтва. Калі гаварыць пра народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі, то ніводзін яго від не ўражвае іншаземных гасцей так, як беларускае саломапляценне.

«Залацістыя саламяныя коні настолькі цудоўныя, што яны супернічаюць з класічнымі скульптурамі ў камені. Саламяныя фігуркі людзей настолькі з густам апранутыя, поўныя жыцця, што архетыпічна нагадваюць сваіх стваральнікаў. Мудрагелістыя птушачкі такія пластычныя, што, здаецца, вось-вось ажывуць. Павукі маюць геаметрычныя формы, падобныя на касмічныя блокі часу... Я ведаў, што некаторыя значныя творы мастацтва, зробленыя з саломкі, прыйшлі ад беларускага народа... Але для мяне аказалася поўнай нечаканасцю тое, наколькі распаўсюджаным і цудоўным саламянае мастацтва застаецца і сёння ў гэтай частцы свету. Падчас свайго першага прыезду я сказаў і ўпэўнены ў гэтым сёння: Беларусь з'яўляецца жамчужынай, каштоўным каменем саламянага свету. Ні ў адной краіне свету работы з саломкі не нясуць у сабе столькі ўнутраных нацыянальных традыцый і рыс, як работы беларускіх майстроў». Так лічыць дырэктар Амерыканскага музея саламянага мастацтва ў ЗША Морган Оўэн Кээлі.

За плячамі гэтага рамяства не адна тысяча гадоў. Вядзе яно сваю гісторыю ад старадаўніх абрадаў, злучаных з культамі хлеба і саломы. Нашы продкі верылі ў чароўную сілу саломы і збожжа, якія берагуць у сабе першародную моц прыроды і шчодра аддаюць яе не толькі сцяблінам і каласам новага ўраджаю, але ўсім, хто так ці інакш, сутыкаецца з імі. Таму так шанаваўся апошні сноп, прыбраны з поля, які захоўваўся ў хаце на покуці да новага ўраджаю. З саломай сяляне злучалі сваё будучае жыццё, надаючы ёй ролю прадказальніцы ў шматлікіх калядных варожбах. Збожжам абсыпалі маладых на вяселлі, а маладую саджалі на салому, каб сіла раслін перадалася маладой сям'і і будучым дзецям. Не злічыць павер'і і абрады, якія звязаны з саломай



і хлебам. Нягледзячы на зменлівасць свету, яны прыйшлі з далёкіх паганскіх часоў і працягваюць жыць побач з намі ў выглядзе твораў майстроў.

**Калядны анёлак з саломкі**



Вышыня 40 см.

**Патрабуецца**:

- саломка align рознай таўшчыні;
- бавоўняныя ніткі № 10;
- леска;
- іголка;
- клей ПВА;
- тоўсты дрот;
- вязальныя ніткі з воўны.

**Тэхніка выканання**: пучковае пляценне з саломкі (гл. мал. 1—3); пляцёнка «ланцужок»; простая пляцёнка; вітая пляцёнка; пляцёнка «зубчатка»; пляцёнка «зубчатка» з ажурным краем.

**Галава.** Вазьміце пучок тоўстых саломін (каля 25 шт.) даўжынёй 36 см. Туга перавяжыце яго 2 разы бавоўнянай ніткай, складзенай 3—4 разы, адступіўшы ад краю на 1 і на 5 см (гл. мал. 1 а). Потым пучок вывернiце і зноў перавяжыце на прамежку 5 см, фарміруючы галаву (гл. мал. 1 б). Для валасоў неабходна сплесці 10 «ланцужкоў» даўжынёй па 12 см. Пасля таго як саломка высахне, расплесці іх і прышыць лескай да галавы.

**Рукі**. Вазьміце дрот для каркаса, на канцы яго закруціце пяцельку. Спляціце простай пляцёнкай 1,5—2 см для далонькі, канцы саломін звяжыце ў пучок ды прывяжыце да пяцелькі на дроце (гл. мал. 2 а). Складзіце ў пучок пяць саломінак для вітай пляцёнкі і прывяжыце іх да асновы далонькі (гл. мал. 2 б). Далей выконваем «вітушку» з саломінак верхняй часткі сцябліны даўжынёй 15—16 см — гэта рука. Прышываем рукі лескай ля асновы корпуса, ніжэй галавы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




Мал. 1




Мал. 2




Мал. 3

**Тулава**. Вазьміце пучок тоўстых саломінак (каля 50 шт.) даўжынёю 36 см. Туга прывяжыце іх да першай нарыхтоўкі на ўзроўні шыі, раўнамерна размяркоўваючы па ўсёй акружнасці (мал. 3 а). Адагніце саломінкі ўніз (выверніце) і яшчэ раз перавяжыце, фарміруючы тулава (мал. 3 б). Кожную саломінку спаднічкі перапляціце нескалькі разоў «васьмёркай» каляровай ніткай. Да пояса і нізу спаднічкі прышываем «зубчатку».

**Крылы** (2 дэталі). Бяром пучок з 15 саломін (на адно крыло) даўжынёй 20 см, туга перавязваем яго пасярэдзіне і распраўляем у выглядзе веера. Кожную саломінку крыла пераплятаем некалькі разоў «васьмёркай» каляровай ніткай. Прышываем крылы лескай на спіне анёлка.

**Німб.** Сплесці «зубчатку» з ажурным краем даўжынёй 25 см і прышыць яе канцы лескай ззаду ля асновы шыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Пано «Калядная зорка»**



**Памер**: дыяметр каля 43 см.
**Патрабуецца**:
- саломка жытняя;
- дрот або тонкія дубчыкі з вярбы;
- атласныя стужачкі або кавалачкі тканіны чырвонага, зялёнага і сіняга колеру;
- клей ПВА ці «Момант»;
- драўляныя дубчыкі;

- іголка;
- леска ці моцныя ніткі ў тон саломкі;
- папера;
- лінейка;
- аловак;
- цыркуль.

Для вырабу пано спатрэбяцца тры плеценыя дэталі. Гэта «ромбы», сплеценыя на каркасе розных памераў, кручаная пляцёнка «Вітушка», сплеценая з пяці саломін, і пацеркі. Спачатку трэба зрабіць эскіз (чарцёж) пано ў натуральную велічыню на паперы — з ім будзе значна прасцей вырабляць зборку, вырабы (эскіз пано ў паменшаным выглядзе паказаны на схеме 1).

Пляцём квадратныя «ромбы» трох памераў з каляровымі «вочкамі» з тканіны (стужкі) у сярэдзіне: 1 цэнтральны з памерам боку 5 см (чырвонае «вочка»), 8 сярэдніх з памерам боку 3,5 см (4 чырвоныя і 4 «вочкі» зялёныя), 8 прамянёў зоркі з памерам боку 3 см (4 чырвоных і 4 «вочкі» зялёных). «Ромбы» лепш плесці з першых каленцаў саломкі.

Для каркаса «ромбаў» бярэм дубчыкі такой даўжыні, каб у гатовых «ромбаў» заставаліся кончыкі каркаса даўжынёй 1,5 см, для цэнтральнага ромба бярэм дубчыкі даўжынёй 13,5—14 см.

Пляцём 4 бусінкі з саламянай стужкі, шырыня якой 1—1,2 см (для цэнтральнага ромба) і 24 бусінкі са стужкі шырынёй 0,7—0,8 см (для крайніх «ромбаў» — прамянёў зоркі). Бусінкі лепш рабіць з другіх каленцаў саломкі.

Далей пачнем выконваць вітую пляцёнку «вітушка» з 5-ці саломінак, шырыня «вітушкі» — 1,5 см, якую можна плесці з тонкіх другіх каленцаў саломкі ці толькі з 1-х каленцаў — у гэтым выпадку «вітушка» атрымліваецца больш вытанчанай (рабрыстай). За аснову возьмем або дрот, працягнуты ў саломінкі, або вярбовыя дубчыкі. Даўжыню іх вымяраюць па чарцяжу, але яны павінны быць даўжэйшымі за гатовую «вітушку» на 4 см.

Спачатку пляцём 2 «вітушкі» для меншага круга і злучаем іх у кольцы ўстык так, каб атрымаць кольца з унутраным дыяметрам 11 см і кольца з унутраным дыяметрам 14 см. Пры гэтым асновы «вітушак» выглядаюць з іх на 2—2,5 см, з кожнага боку змазваем клеем і ўстаўляем у супрацьлеглыя канцы «вітушкі», таксама змазаныя клеем.

Гатовыя «вітушкі» накладваем на чарцёж, даём высахнуць клею і сшываем швом «васьмёрка» (шоў амаль незаўважны, гл. мал. А). У цэнтр атрыманага здвоенага кольца ўстаўляем самы вялікі (цэнтральны) ромб, папярэдне нанізаўшы на яго заплеценыя кончыкі каркаса 4 самыя вялікія пацеры. Ромб у коле замацоўваем з дапамогай іголкі з ніткай або клею.

Пляцём яшчэ дзве «вітушкі» такой даўжыні, каб атрымаліся кольцы з ўнутранымі дыяметрамі 27 і 30 см. Гэтыя кольцы ўкладваем адно ў другое і сшываем гэтак жа, як і маленькія.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Схема пляцення



Схема 1



Мал. А




Схема 2

Далей трэба сплесці «вітушкі» для слупкоў паміж сярэднімі «ромбамі» — 16 штук даўжынёй 4,5—4,7 см. Для асновы слупкоў бярэм палачкі-зубачысткі або кароткія дубчыкі. Слупкі сшываем парамі (як і кольцы) і ўстаўляем паміж першай і другой парай кольцаў (гл. схемы 1 і 2).

Паміж слупкамі ўстаўляем сярэднія ромбы такім чынам, каб насупраць вяршыняў цэнтральнага ромба размяшчаліся ромбы з чырвоным «вочкам», а наадварот насупраць бакоў цэнтральнага ромба — ромбы з зялёным «вочкам». Вяршыні сярэдніх ромбаў і канцы слупкоў змацоўваем з «вітушкай» ніткамі і клеем.

Цяпер пляцём 2 рады маленькіх ромбаў памерам 2 см. Даўжыня агульных асноў каркаса роўная даўжыні акружнасці здвоеных кольцаў «вітушак» плюс яшчэ 3 см (даўжыню акружнасці вымяраем па лініі сшывання «вітушак»). Тыя кончыкі каркаса, што засталіся пасля пляцення, акуратна адкусваем кусачкамі і адразу ж змазваем клеем, каб «ромбікі» не распусціліся.

У працэсе работы «вочкі» з тканіны чаргуем: чырвоны, сіні, зялёны, чырвоны, сіні, зялёны і г.д.

Злучаем гірлянды ў кольцы і нашываем на цэнтральнае (злучальнае) кольца швом пары «вітушак», маскіруючы пакінутыя канцы асноўнага каркаса. Нарэшце трэба прымацаваць 8 «ромбаў» з бокам 3 см насупраць «ромбаў» сярэдняга рада. Для гэтага адзін канец каркаса «ромба» ўстаўляем у «вітушку», прышываем і змазваем клеем. А на пакінутыя канцы каркаса, змазаныя клеем, замацоўваем пацеркі — па тры на кожны ромб (гл. схему 2). Для замацавання пано на сценцы трэба зрабіць пятлю з нешырокай тасьмы або стужкі, прымацаваўшы яе да пары «вітушак» вялікага дыяметра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ